Источник:"Мінская праўда"-2013-11-05

# Чалавек Сусвету

**Так назвала знакамітага беларускага этнографа, паэта, паўстанца і падарожніка, свайго земляка Адольфа Янушкевіча мясцовая паэтка Дзяржыншчыны Ядвіга Доўнар на ўрачыстым мітынгу, што прайшоў на радавых могілках слыннай сям'і Янушкевічаў у вёсцы Дзягільна Дзяржынскага раёна і быў прымеркаваны да 210-й гадавіны з дня нараджэння таленавітага земляка.**

стр. 2

Святлана Хорсун. Чалавек сусвету

# ЧАЛАВЕК СУСВЕТУ

1 стар.

Яго арганізатары — парламентарыі на чале з намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзіславам Цыдзікам, а таксама Дзяржынскі райвыканкам. У мерапрыемстве браў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь Ергалі Булегенаў, які завітаў сюды разам з групай казахскай інтэлігенцыі.

«Імя Адольфа Янушкевіча, юбілей якога святкуюць у Беларусі, добра ведаюць і на зямлі Казахстана, — адзначыў пасол. — І вельмі прыемна, што дружба паміж казахамі і беларусамі з часоў XIX стагоддзя працягваецца і сёння».

Адольф Янушкевіч нарадзіўся ў Нясвіжскім замку ў небагатай дваранскай сям'і, закончыў літаратурны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Атрымаўшы еўрапейскую адукацыю, пабываў у Францыі, Германіі, Італіі. Пасля ўдзелу ў паўстанні трапіў у ссылку на казахстанскія землі. Свае ўражанні ён занатаваў у «Пісьмах з кіргізскіх стэпаў» (так у той час называлі землі Сярэдняй Азіі).

— Цікава, што ў гэтага чалавека шматграннага таленту ёсць яшчэ адна малавядомая грань — талент прароцтва, — адзначыў у сваім выступленні намеснік старшыні Мінаблвыканкама Аляксандр Юшкевіч. — Яшчэ ў далёкім дзевятнаццатым стагоддзі Адольф Янушкевіч сказаў, што менавіта Астана стане «сталіцай стэпаў».

У гэты дзень на радавых могілках у Дзягільне адбылося ўрачыстае адкрыццё манумента ў гонар вядомага земляка з удзелам духавенства мясцовага касцёла, а таксама пасадка дрэўцаў на Алеі памяці. У Дзяржынскай раённай бібліятэцы прайшлі міжнародныя Койданаўскія чытанні, прысвечаныя 210-годдзю з дня нараджэння Адольфа Янушкевіча, у якіх бралі ўдзел госці з Казахстана і інтэлігенцыя Беларусі. Шмат цікавага пра «бурштынавае пяро Адольфа Янушкевіча» расказаў казахскі пісьменнік, даследчык яго творчасці Амар Хакім. Пра свае падыходы да творчасці знакамітага земляка, які ўнёс вялікі ўклад не толькі ў беларускую, але і ў рускую, польскую, англійскую, украінскую і казахскую культуру, паведамілі доктар філалагічных навук прафесар Адам Мальдзіс, кандыдат гістарычных навук Белдзяржуніверсітэта Вольга Гарбачова, мясцовы краязнаўца і гісторык Анатоль Валахановіч. Цікава было даведацца і пра вынікі археалагічных даследаванняў старых могілак у Дзягільне, пра якія паведаміў старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі кандыдат гістарычных навук Мікалай Крывальцэвіч.



У час урачыстага мітынгу на радавых могілках Адольфа Янушкевіча ў Дзягільне.

Фота Наталлі ТРАЦЭЎСКАЙ.

**Святлана ХОРСУН.**